Несур'ёзна пра сур'ёзнае

## Генадзь Аўласенка

# Паэзія без габарытаў

*Гумарыстычны зборнік*

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2019

УДК 821.161.3-1
ББК 84(4Беи)-5
А20

*Серыя заснавана ў 2014 годзе*

Рэдакцыйны савет:
*М. В. Шабовіч, А. М. Зэкаў, К. В. Камейша,*
*Л. Ф. Анцух, В. А. Губараў, А. В. Кубышкіна*

**Аўласенка, Г. П.**

А20 Паэзія без габарытаў : гумарыстычны зборнік / Генадзь Аўласенка. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2019. — 108 с. — (Несур'ёзна пра сур'ёзнае).

ISBN 978-985-581-336-2.

У новым зборніку вядомага беларускага пісьменніка Генадзя Аўласенкі "Паэзія без габарытаў" чатыры раздзелы: "Гэты нядобры Тузік", "Паэзія без габарытаў", "Каханне і гарох", "Каса на камень".

Чытачы пазнаёмяцца з гумарыстычнымі вершыкамі, пародыямі на вершы знакамітых паэтаў, а таксама са сцэнкамі з нашага бурлівага жыцця — іх няцяжка будзе паставіць не толькі ў народных і самадзейных тэатрах, але і сіламі школьных драматычных гурткоў.

Адрасуецца шырокаму колу чытачоў.

**УДК УДК 821.161.3-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-336-2**

© Аўласенка Г. П., 2019
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2019

# Гэты нядобры Тузік



Вершы

## Сіла варажбы

— Я чула: муж твой моцна піў?
— Калі яно было!
Да варажбіткі раз схадзіў —
і як рукой зняло!
— Вось дзіва,
што і гаварыць!
Ты радуешся?
— Не!
Ён кінуў піць...
Затым курыць...
А потым і мяне!

## «Прагная» жонка

— Хвіліны жонка не маўчыць!
І ад сняданка да вячэры:
«Дай грошы!» — кожны дзень крычыць...
Ну, трэба ж неяк ведаць меру!
— Так, прагная ў цябе кабета!
Куды ёй столькі, ты б спытаў...
— Адкуль мне ведаць!
Я ж дагэтуль
шчэ ані разу ёй не даў!

## З якога боку паглядзець...

— Што сумны, сын? З якой прычыны?
Пакрыўдзілі цябе, відаць...
— Ды ўжо чацвёртую дзяўчыну
прасіў маёю жонкай стаць!
І зноў не атрымаў я згоды...
Ну, як, скажы, не гараваць?!
— Эх, сынку, ведай: не заўсёды
табе так будзе шанцаваць!

## Хто больш дзікі?

— Ну, як учора паляванне?
Ці зноў пустым дамоў прыйшоў?
— Ды не! Пад вечар, на змярканні,
канаву з качкамі знайшоў!
Дуплетам — бац! І ўсе ляжаць...
— А качкі дзікія... не йначай?
— Ну, качкі... як табе сказаць...
Затое гаспадыня качак!

## На асабістым прыкладзе

— Міколка,
ты чаму такі мурзаты?
— З сястрычкай
мы гулялі ў маму з татам!

— І мокры ўвесь,
аж з галавы да ног!
— Ну, як кажу:
гулялі ў маму з татам!
Яна мяне
вяла з гасцей дахаты,
А я,
зусім як тата наш на свята,
ішоў, ішоў...
ды ў лужыну пялёх!

## На прыёме ў псіхіятара

**1**
— Цяпер скажыце,
небарака,
калі ўсё пачалося
ў вас?
Калі аб тым,
што вы — сабака,
прыйшла вам думка
ў першы раз?

Аб гэтым думаў я цішком
яшчэ маленькім шчанюком...

**2**
— Мой муж знайшоў сабе забаву:
як толькі вып’е ранкам каву,

адразу ж кубачак з'ядае
і толькі ручку пакідае...

— Я бачу: ён у вас дзівак!
Якраз жа ў ручках самы смак!

## Тут трэба падумаць...

— Калі на скрыпачцы,
сынок,
крыху пайграеш,
табе я
шакаладку абяцаю!

Ды тата мне
аж дзве паабяцаў,
каб толькі я
па вечарах не граў!

## Навошта ж так нясціпла?

— Ты ведаеш:
на кожным са спатканняў
яна мне задае
нясціплыя пытанні!
Такія,
што я толькі чырванею,
а што ёй адказаць,
не разумею!

— Ну, і аб чым
яна цябе пытае?
— Напрыклад,
колькі ў месяц зарабляю...

## Вычарпальны адказ

— А вось чаму,
скажы, Алесь,
не могуць рыбы
гаварыць?

— А сам ты
пад ваду залезь
і паспрабуй там
рот раскрыць!

## Не так, як раней

— Эх, сябра, як тут ні круці,
усё змяняецца ў жыцці!
Раней, калі дамоў прыходзіў
і толькі ў свой пакой заходзіў,
сабака брэхам сустракала,
пантофлі жонка падавала...

— І што ж змянілася, Фядот?
— Цяпер — усё наадварот!

# Пра аўтара



Генадзь Пятровіч Аўласенка нарадзіўся 16 жніўня 1955 года ў вёсцы Ліпавец Ушацкага раёна Віцебскай вобласці.

Скончыў біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, шмат гадоў працаваў настаўнікам біялогіі і хіміі ў школах Чэрвенскага раёна. З 2013 па 2017 гады — намеснік галоўнага рэдактара часопіса для падлеткаў «Бярозка».

Да літаратурнай працы прыйшоў даволі позна. Аўтар вершаў, п'ес, прозы, займаецца перакладамі. Творы Генадзя Аўласенкі актыўна друкуюцца ў беларускай перыёдыцы і калектыўных зборніках. З 2009 па 2019 гады ў вядучых выдавецтвах Рэспублікі Беларусь выйшла больш за два дзясяткі кніг на беларускай і рускай мовах, многія з якіх для дзяцей.

Лаўрэат і дыпламант шматлікіх літаратурных конкурсаў. Пераможца першага рэспубліканскага гумарыстычнага конкурсу «Папяровы бусел-2019».

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1999 года.

Жыве ў г. Чэрвені.

# ЗМЕСТ

## ГЭТЫ НЯДОБРЫ ТУЗІК

### *Вершы*

Сіла варажбы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
«Прагная» жонка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4
З якога боку паглядзець… . . . . . . . . . . . . 5
Хто больш дзікі? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
На асабістым прыкладзе . . . . . . . . . . . . . 5
На прыёме ў псіхіятара . . . . . . . . . . . . . . 6
Тут трэба падумаць… . . . . . . . . . . . . . . . 7
Навошта ж так нясціпла? . . . . . . . . . . . . 7
Вычарпальны адказ . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Не так, як раней . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Невядомы канал . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
Размова двух сяброўак . . . . . . . . . . . . . . 9
Лепшы час для музыкі . . . . . . . . . . . . . . 10
У рэстаране . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Гэты нядобры Тузік . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Дарэмна спалохаўся . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Не той «падарунак» . . . . . . . . . . . . . . . . 12
Доктар забараніў . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
За што папала? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
Знаёмая міска . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14
«Поўны гаспадар» . . . . . . . . . . . . . . . . . 15

Пытацца нельга! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Хто ж там курыць? . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
Чаму сумны? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Добра, што не згубіў! . . . . . . . . . . . . . . . 18
Гэта ўжо залішне! . . . . . . . . . . . . . . . . . 18
Колькі яна там вып’е! . . . . . . . . . . . . . . . 19
Мастак мастаку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
Падманутае каханне . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Палёгка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20
Размова з адвакатам . . . . . . . . . . . . . . . 21
Размова з рэдактарам . . . . . . . . . . . . . . . 21
Размова з заказчыкам . . . . . . . . . . . . . . . 21
«Смяльчак» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
У заапарку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22
«Шкодная» звычка . . . . . . . . . . . . . . . . . 23
Што можа медыцына? . . . . . . . . . . . . . . . 23
Без чаго можна ехаць? . . . . . . . . . . . . . . 24
Вось гэта вернасць! . . . . . . . . . . . . . . . . 24
Значыцца, сапраўдная! . . . . . . . . . . . . . . 25
На экзамене . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 25
Няма чаго сердаваць . . . . . . . . . . . . . . . 26
Поўнае «алібі» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Праблема з цярплівасцю . . . . . . . . . . . . . 27
Размова з камунальнікамі . . . . . . . . . . . . 27
Тады гэта не ён! . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
У бальніцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

У нагу з часам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
У параўнанні з астатнімі… . . . . . . . . . . . . . . 30
Як вызначыць поўдзень? . . . . . . . . . . . . . . . 30
«Безвыходнае» становішча . . . . . . . . . . . . . . 31
Гэта не бяда! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Паэт-авангардыст . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
За што звольнілі? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
Каб жа быў рэцэпт! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
Ледзь не паверыў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
Не трэба рызыкаваць . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Лепш схаваць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Найлепшыя «таблеткі» . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Падарунак ад злодзея . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Праблема зроку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Хіба ж гэта рыбак! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
Хоць якая карысць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Хто самы «круты»? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Ці павесялее? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
«Новая» машына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Няўжо яна так і сказала? . . . . . . . . . . . . . . . 38
Прынцыповая розніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Які ж гэта давер? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Які нядобры пачтальён! . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Кругаварот . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Ода каларадскаму жуку . . . . . . . . . . . . . . . . 41

## ПАЭЗІЯ БЕЗ ГАБАРЫТАЎ

### *Пародыі*

Мары, мары... (Аксана Данільчык) . . . . . . . . . . . . . 44
Раздвоенасць (Віка Трэнас). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Я тут ні пры чым (Віка Трэнас). . . . . . . . . . . . . . . . . 46
Усюды паэзія (Аксана Спрынчан) . . . . . . . . . . . . . . 47
А вы што падумалі? (Вера Міхно) . . . . . . . . . . . . . . 48
Нічога сабе жартачкі! (Вольга Коваль) . . . . . . . . . 48
Ці ж гэтак прыручаюць? (Вольга Коваль) . . . . . . . . 49
Рэцэпт напісання тэрцэтаў
(Вячаслаў Дашкевіч). . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50
З палону ды ў палон (Яўген Гучок) . . . . . . . . . . . . . 51
Абы не гыркаў (Кацярына Шатаво) . . . . . . . . . . . . . 52
Добра, што не Экзюперы
(Леанід Дранько-Майсюк) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Суцэльная сінгулярнасць (Марыя Шамякіна) . . . . 54
Сямейная імпрэсія (Марыя Шамякіна) . . . . . . . . . . 55
Прысніцца ж такое! (Віктар Ыванoў) . . . . . . . . . . . 56
Лепш бы ўжо русалка! (Віктар Гардзей) . . . . . . . . . 57
Добра, што хоць якасныя! (Таццяна Будовіч). . . . . 58

### *Карацелькі*

Не тое шукаў (Таццяна Будовіч) . . . . . . . . . . . . . . . 59
Спачатку рэстаран! (Таццяна Будовіч). . . . . . . . . . 59
Дажартавалася! (Таццяна Будовіч). . . . . . . . . . . . . 60

Што можна рабіць з вершам?
(Таццяна Будовіч) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Як мы ішлі «nach Hause» (Таццяна Сівец) . . . . . . . 61
За што штраф? (Ярына Дашына) . . . . . . . . . . . . . 62
Паэзія без габарытаў (Ярына Дашына) . . . . . . . . . 63
Паэзія ў ЖЖ (Ярына Дашына) . . . . . . . . . . . . . . 64
Ніхто так вершы не піша...
(Вольга Чайкоўская) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
Нака вам! (Вольга Чайкоўская) . . . . . . . . . . . . . 66
Кыш, камары! (Людка Сільнова) . . . . . . . . . . . . 66
«Класічная» гісторыя (Мікола Адам) . . . . . . . . . . 67
Як тут не «нарэзацца»? (Сяргей Украінка) . . . . . . . 68
«Умоўна» не атрымалася (Юлія Новік) . . . . . . . . . 69
Які ж гэта паэт?! (Юрась Нераток) . . . . . . . . . . . 70

## КАХАННЕ І ГАРОХ

### *Гісторыі-рыфмаванкі*

Аб шкодзе палявання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72
Вясковае здарэнне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Дарагі каньяк . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Каб нічога не згубіць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Каханне і гарох . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Сіла звычкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78
Тэорыя правільнага пошуку . . . . . . . . . . . . . . . 79
Шчупак і рыбак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81

## КАСА НА КАМЕНЬ

### *Сцэнкі*

Знайсці вярблюда . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Каса на камень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89
Стыль кіраўніцтва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94

*Пра аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 101